ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі універсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ І ПРАФКОМАЎ ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 28 (622) | Субота, 26 кастрычніка 1985 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года. Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап

## ГОСЦІ З ПНР

Калектывы Гомельскага кааператыўнага інстытута і Еленегурскага факультэта Вроцлаўскай эканамічнай Акадэміі імя Оскара Ланге з'яўляюцца пабрацімамі. На гэтым тыдні польскія сябры прыехалі да гамяльчан у госці. У сераду яны наведалі і наш універсітэт. У састаў дэлегацыі ўваходзілі дэкан факультэта Данута Штраль, дацэнт, першы сакратар партыйнай арганізацыі факультэта Францішак Адамчык і выкладчыца рускай мовы, член праўлення Еленегурскага таварыства польска-савецкай дружбы Крысціна Серафін. Іх суправаджалі адказны сакратар Гомельскага абласнога аддзялення Беларускага таварыства дружбы і культурных сувязей з замежнымі краінамі Т. В. Сафронава і прарэктар па выхаваўчай рабоце ГКІ М. П. Дайнека.

На сустрэчы прарэктар універсітэта Л. Н. Сечка расказаў пра вядучую вышэйшую навучальную ўстанову Беларускага Палесся, перспектывах яе развіцця. Аб падрыхтоўцы спецыялістаў на эканамічным факультэце гаварыў яго дэкан прафесар У. Д. Арэшчанка.

Сябры атрымалі вычарпальныя адказы на зададзеныя пытанні, азнаёміліся з кафедрамі і лабараторыямі эканамічнага факультэта.

На памяць аб сустрэчы гасцям былі ўручаны сувеніры.

**29 кастрычніка — Дзень нараджэння камсамола**

КАМСАМОЛЬЦЫ І МОЛАДЗЬ! НЯСТОМНА АВАЛОДВАЙЦЕ ВЕДАМІ, КУЛЬТУРАЙ, ПРАФЕСІЯНАЛЬНЫМ МАЙСТЭРСТВАМ. ПРЫМНАЖАЙЦЕ РЭВАЛЮЦЫЙНЫЯ, БАЯВЫЯ І ПРАЦОЎНЫЯ ТРАДЫЦЫІ ПАРТЫІ І НАРОДА!

НЯХАЙ ЖЫВЕ ЛЕНІНСКІ КАМСАМОЛ — БАЯВЫ ПАМОЧНІК І НАДЗЕЙНЫ РЭЗЕРВ КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ!

(З Заклікаў ЦК КПСС).

ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ АТЭСТАЦЫЯ

## КРЫТЫЧНА, ПРЫНЦЫПОВА

20 кастрычніка на эканамічным факультэце праходзіла грамадска-палітычная атэстацыя па Ленінскаму заліку. Гэта мерапрыемства мае вялікае значэнне для ацэнкі грамадска-палітычнай, выхаваўчай і ідэалагічнай работы сярод студэнтаў.

Ленінскі залік стаў галоўнай формай індывідуальнай ацэнкі кожнага камсамольца.

Студэнты эканамічнага факультэта прыйшлі на залік з асабістымі комплекснымі планамі і давалі справаздачу перад атэстацыйнай камісіяй, таварышамі аб выкананні ўзятых абавязацельстваў.

Члены атэстацыйных камісій, а ў іх уваходзілі выкладчыкі, члены камітэта камсамола факультэта і прадстаўнікі камітэта ЛКСМБ ГДУ, з увагай слухалі кожнага студэнта.

У час грамадска-палітычнай атэстацыі абмяркоўваліся пытанні паляпшэння паспяховасці, сацыяльнай актыўнасці, умацавання дысцыпліны студэнтаў.

На жаль, нямала студэнтаў эканомфака не з'явіліся на Ленінскі залік, паставіўшы асабістыя інтарэсы вышэй грамадскіх. Так, у групе Т-23 (камсорг Г. Сергель) адсутнічала 9 камсамольцаў, у групе 0-21 (камсорг В. Гаўрыленка) — 5, у гр. Т-33 (камсорг С. Шалейка) — 6, у гр. 0-22 (камсорг Н. Прылілка) — 3. Персанальныя справы гэтых студэнтаў будуць разгледжаны на камсамольскіх сходах груп.

Атэстацыя паказала, што ў многіх акадэмічных групах дрэнна абстаяць справы з паспяховасцю. Напрыклад, па выніках летняй экзаменацыйнай сесіі ў групе 0-31 — шэсць нездавальняючых адзнак, у гр. 0-32 — 8, у гр. 0-21 толькі два чалавекі вучацца без троек, выдатнікаў няма наогул. Яшчэ на сённяшні дзень маюць запазычанасці па тых ці іншых дысцыплінах вучэбнай праграмы студэнты Геронiна (гр. 0-21), Дрозд (0-22), Бурава, Баравік, Бардукова, Варанкевіч, Гамзатава, Дземідовіч (0-31), Грамыка, Кавалёва, Кітаева, Прыходзька, Сучкова, Шаўцова, Ятчанка, Плюта (0-32), Каракошка (Т-21), Н. Яроменка і О. Яроменка (гр. 0-41). Усе гэтыя камсамольцы, а таксама Я. Быкоўскі, які паказаў вельмі слабую падрыхтаванасць па грамадска-палітычных пытаннях, не былі атэставаны.

На належным узроўні прайшла атэстацыя ў групах: Т-21, Т-31, Т-41, 0-42, Т-43.

Грамадска-палітычная атэстацыя камсамольцаў паказала, у якіх напрамках работы існуюць істотныя недапрацоўкі і недахопы. Так, у кожнай групе ёсць студэнты, якія не прымаюць удзел у грамадскім жыцці групы, факультэта, універсітэта. Задача камсоргаў — даць такому кожнаму студэнту канкрэтнае даручэнне і строга спытаць аб яго выкананні.

Не так, як належыць, ідуць на эканомфаку справы з фарміраваннем студэнцкіх будаўнічых атрадаў. Працэнт удзелу студэнтаў у СБА ў параўнанні з мінулымі гадамі прыкметна знізіўся, што сведчыць аб пасіўнасці камсамольцаў.

Галоўнае, на што трэба звярнуць увагу студэнтам эканамічнага факультэта,— гэта павышэнне паспяховасці, актывізацыя грамадскай актыўнасці кожнага юнака і дзяўчыны.

**Ірына НЕШЫК,**
**студэнтка 4-га курса эканамічнага факультэта, старшыня прэс-цэнтра.**

## ПА АСНОВАХ ПРАПАГАНДЫ

Пачынаецца новы навучальны год у падраздзяленнях факультэта грамадскіх прафесій. Пазаўчора першыя заняткі адбыліся ў Школе маладога лектара. Перад яе слухачамі па тэме «Навуковыя асновы камуністычнай лекцыйнай прапаганды» выступіў дэкан ФГП па грамадскіх пачатках дацэнт кафедры палітэканоміі А. І. Канашэвіч.

*Вынікі асенняга семестра*

## ЗРОБЛЕНА ШМАТ

Гэта ўжо даўняя традыцыя — аказанне студэнтамі дапамогі на ўборцы бульбы гаспадаркам вобласці. Не ў першы раз адпраўляліся студэнты матэматычнага факультэта на сельгасработы ў Петрыкаўскі раён. І гэтай восенню паехалі туды будучыя матэматыкі—у саўгас «Галубіцкі».

За час знаходжання студэнтаў у гаспадарцы зроблена вельмі шмат: убрана бульба з плошчы 109 га. За камбайнамі і КТН сабрана звыш 200 тон «другога хлеба», для здачы яго дзяржаве перабрана і затарана 126 тон.

Усе без выключэння камсамольцы старанна працавалі ў дзень ударнай працы —22 верасня. Заробленыя грошы пералічаны ў фонд АК ЛКСМБ.

Не толькі на бульбяных палетках паказалі сябе з лепшага боку студэнты. Разам з навучэнцамі ГПТВ-78 яны падрыхтавалі цікавы канцэрт, з якім выступілі перад жыхарамі вёскі Галубіца, аказалі дапамогу мясцовай школе ў афармленні памяшкання, падрыхтоўцы наглядных дапаможнікаў.

У вольны час шматлюдна было на спартыўнай пляцоўцы, дзе рабяты гулялі ў валейбол, баскетбол. Увесь перыяд студэнты знаходзіліся ў курсе ўсіх падзей, што адбываліся ў нашай краіне і за рубяжом. Іншы раз на полі ў час невялічких перапынкаў праводзіліся палітінфармацыі, абмяркоўваліся найбольш цікавыя матэрыялы перыядычнага друку.

За добрыя поспехі ў працы наш атрад «Маналіт» быў узнагароджаны граматамі Петрыкаўскага райкома ЛКСМБ, дырэкцыі саўгаса «Галубіцкі». Удастоены грамат райкома камсамола Л. Аўдашкова, В. Васкрасенскі, В. Кушнярова, А. Козыраў, Т. Рэзнік, Л. Шкуратава, грамат саўгаса — Н. Зубкова, А. Мануленка, Н. Лісковіч і інш.

Закончыўся наш асенні працоўны семестр. Але і цяпер на перапынках паміж заняткамі мы ўспамінаем нашы працоўныя будні і радуемся таму, што змаглі ўнесці свой пасільны ўклад у выкананне Харчовай праграмы.

**К. БУТЫРЫНА,**
**камісар атрада «Маналіт», студэнтка матэматычнага факультэта.**

## У імя міру і бяспекі

Выйшаў у свет зборнік «Візіт Генеральнага сакратара ЦК КПСС М. С. Гарбачова ў Францыю». Ён змяшчае выступленне М. С. Гарбачова па французскім тэлебачанні, дакументы і матэрыялы аб яго візіце ў Францыю 2—5 кастрычніка 1985 года.

Кніга выпушчана Выдавецтвам палітычнай літаратуры.

(ТАСС).

## ВІНШУЕМ!

**Рэктарат, партком, грамадскія арганізацыі універсітэта, калектыў фізічнага факультэта і кафедры оптыкі горача віншуюць асістэнта ШОЛАХ Валянціну Рыгораўну з паспяховай абаронай дысертацыі на атрыманне вучонай ступені кандыдата фізіка-матэматычных навук.**

*На ўстановачнай канферэнцыі*

## ПАТРАБАВАННЕ ДА ЎСІХ

У Гомелі адбылася ўстановачная канферэнцыя Беларускага рэспубліканскага добраахвотнага таварыства барацьбы за цвярозасць.

У дакладзе старшыні аргкамітэта, рэктара Гомельскага дзяржаўнага універсітэта, акадэміка АН БССР Б. В. Бокуця, выступленнях удзельнікаў канферэнцыі дакладна прагучала думка: перад намі пастаўлена задача не наогул аб узмацненні барацьбы з п'янствам і алкагалізмам, а аб пазбаўленні ад гэтага сацыяльна небяспечнага зла. Таму неабходна мабілізаваць усе намаганні на выкараненне п'янства, пачаць усенародны паход за цвярозасць, за здаровы быт.

Актыўна ўключыліся ў барацьбу супраць п'янства на вытворчасці і па месцы пражывання насельніцтва прафсаюзныя арганізацыі. Так, прафсаюзнымі камітэтамі вобласці за сёлетнія чэрвень—верасень, гэта значыць, з моманту ўступлення ў сілу Указа Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР, прыцягнута да адказнасці звыш 18,5 тысячы чалавек, у тым ліку к 147 з іх прыменена крайняя мера ўздзеяння — выключэнне з членаў прафсаюза.

Развіваецца масавы рух «Працоўнай дысцыпліне — гарантыю калектыву». Усё больш шырокае распаўсюджанне атрымлівае пачын «У прафсаюзнай групе — ніводнага парушальніка працоўнай дысцыпліны і грамадскага парадку».

Праводзіцца работа па стварэнню клубаў барацьбы за цвярозасць. Іх ужо створана пятнаццаць.

Разам з камітэтамі камсамола членам таварыства прадстаіць шырокім фронтам разгарнуць антыалкагольную прапаганду сярод моладзі. Даўно вядуць актыўны пошук новых форм работы камітэты камсамола Светлагорска, Нароўлі, Чачэрска. Ініцыятарамі правядзення безалкагольных вяселляў у нас у вобласці сталі студэнты. Адкрыццё безалкагольных кафэ і бараў па вартасці ацаніла моладзь.

Нельга пакінуць без увагі і маладзёжныя інтэрнаты вобласці, у якіх жывуць зараз звыш 50 тысяч чалавек. Добра прадуманы, цікавы адпачынак у немалой ступені садзейнічае цвярозаму, здароваму быту пражываючых. Дапамога актывістаў таварыства барацьбы за цвярозасць тут таксама неабходна.

Ажыццяўляючы на практыцы рэалізацыю распрацаваных партыяй і ўрадам мер, прафсаюзныя камітэты, саветы добраахвотных фізкультурна-спартыўных таварыстваў сумесна з гаспадарчымі органамі, камітэтамі камсамола і іншымі грамадскімі арганізацыямі вобласці правялі пэўную работу па прыцягненню новых кантынгентаў працоўных і моладзі да рэгулярных заняткаў фізічнай культурай і спортам.

Але, нягледзячы на прымаемыя меры, частка ўстаноў культуры і спартыўных збудаванняў па-ранейшаму не працуюць з поўнай нагрузкай, нярэдка выкарыстоўваюцца не па прызначэнню. Дапамагчы ім у арганізацыі змястоўнага адпачынку працоўных — адна з першачарговых задач таварыства.

Удзельнікі канферэнцыі звярнуліся да ўсіх прадпрыемстваў, арганізацый і ўстаноў вобласці, ветэранаў партыі і працы, кадравых і маладых рабочых, калгаснікаў, служачых, пенсіянераў і хатніх гаспадынь, студэнтаў, навучэнцаў і школьнікаў — яшчэ з большай адказнасцю ўключыцца ва ўсенародную барацьбу за зацвярджэнне цвярозага ладу жыцця, аб'яднаць намаганні за поўнае і канчатковае выкараненне п'янства і алкагалізму.

Установачная канферэнцыя выбрала абласны савет і рэвізійную камісію.

• • •

На прайшоўшым першым пасяджэнні абласнога савета Беларускага добраахвотнага таварыства барацьбы за цвярозасць выбрана праўленне абласнога савета. Яго старшынёй выбраны рэктар Гомельскага дзяржаўнага універсітэта, акадэмік АН БССР Б. В. Бокуць.

**Т. САКАЛОВА.**

## З АГУЛЬНАУНІВЕРСІТЭЦКАГА СПРАВАЗДАЧНА-ВЫБАРНАГА ПАРТЫЙНАГА СХОДУ

# КРЫНІЦА ПОСПЕХАЎ

лізмам. Партком і рэктарат, дэканаты і партбюро, грамадскія арганізацыі праводзяць практычную работу па ажыццяўленню гэтых мер.

У СПРАВАЗДАЧНЫМ перыядзе ў полі зроку парткома пастаянна знаходзіліся грамадскія арганізацыі і фарміраванні. Ён імкнуўся мэтанакіравана кіраваць дзейнасцю прафсаюзных і камсамольскіх арганізацый, камітэта ДТСААФ, арганізацыі таварыства «Веды», Савета кафедр грамадскіх навук, ФГП, Савета куратараў, ДНД, дэканата па прафарыентацыі і рабоце са стажорамі і г. д. Усяго ва універсітэце цяпер налічваецца 50 грамадскіх арганізацый і фарміраванняў. Яны ўносяць пэўны ўклад у аказанне дапамогі парткому і рэктарату ў арганізацыі вучэбнай, навукова-даследчай, ідэйна-выхаваўчай работы.

Важную ролю ў выхаванні высокамастацкіх густаў, развіцці творчых уменняў і навыкаў, арганізацыі вольнага часу студэнтаў адыгрываюць аматарскія аб'яднанні — клубы па інтарэсах. Ва універсітэце іх налічваецца ўжо дзевяць. Студэнцкая творчасць атрымала высокую ацэнку. Так, студэнцкаму тэатру сёлета прысвоена ганаровае званне народнага.

Значная ўвага ў дакладзе была ўдзелена рабоце прафсаюзных арганізацый. Адзначана, што ў іх дзейнасці разам са станоўчым маюць месца і істотныя недахопы. Ва універсітэце, на факультэтах і ў іншых яго структурных падраздзяленнях нерэгулярна праводзяцца вытворчыя нарады, што не адпавядае патрабаванням Закона СССР «Аб працоўных калектывах і павышэнні іх ролі ў кіраванні прадпрыемствамі, установамі, арганізацыямі».

Партыйны камітэт і партбюро факультэтаў належным чынам ажыццяўляюць кіраўніцтва камсамолам. Гэтым самым на практыцы рэалізуецца пастанова ЦК КПСС «Аб далейшым паляпшэнні партыйнага кіраўніцтва камсамолам і павышэнні яго ролі ў камуністычным выхаванні моладзі».

Добрыя пачынанні, ініцыятывы знаходзілі і будуць знаходзіць падтрымку ў парткоме, партбюро, рэктараце і дэканатах. Разам з тым, у вырашэнні некаторых пытанняў камітэт камсамола і камсамольскія бюро павінны ўдзельнічаць больш актыўна. У прыватнасці, прынцыповай ацэнкі патрабуюць выпадкі пропуску студэнтамі заняткаў без уважлівых прычын, недысцыплінаванасці, парушэнняў правіл пражывання ў інтэрнатах і г. д.

Партыйны камітэт і рэктарат чакаюць канкрэтных, практычных рэкамендацый ад Савета куратараў, сацыялагічнай групы, Савета кафедр грамадскіх навук, нядаўна адкрытай ва універсітэце кафедры этыкі, эстэтыкі і навуковага атэізму ў павышэнні эфектыўнасці ўсёй выхаваўчай работы.

У СПРАВАЗДАЧНЫМ перыядзе партком працягваў удасканальваць сваю арганізацыйна-партыйную работу. Прымяніліся ўсе меры па выкананню крытычных заўваг і прапаноў камуністаў, выказаных на папярэднім справаздачна-выбарным партыйным сходзе.

Кантроль і праверка выканання, гаварыў далей дакладчык,— гэта аснова ўсёй работы. Аднак іншы раз шмат часу даводзіцца траціць на запаўненне разнастайных справаздач, даведак, выканання інструкцый, рэкамендацый і г. д. Неапраўдана прымаецца вялікая колькасць пастаноў і рашэнняў. Таму рэктарату і парткому неабходна дакладна вызначыць пералік форм і справаздач сапраўдных для работы, павесці барацьбу з паператворчасцю.

У справаздачны перыяд ажыццёўлена і апраўдала сябе перабудова структуры партыйнай арганізацыі. Пасля расфарміравання партарганізацыі ўпраўлення рэктар і прарэктары, сакратар парткома, старшыні прафкомаў, сакратар камітэта камсамола, кіраўнікі іншых падраздзяленняў пастаўлены на ўчот у партарганізацыі факультэтаў і АГЧ. Гэта дазволіла больш аператыўна і шырока даводзіць да камуністаў пастановы парткома, рашэнні рэктарата, Савета універсітэта, лепш рэагаваць на крытычныя заўвагі і прапановы.

Партыйныя бюро і партком праводзілі мэтанакіраваную работу па адбору ў партыю лепшых студэнтаў і выкладчыкаў, уключаных у рэзерв. За справаздачны перыяд рады партарганізацыі універсітэта папоўнілі 18 студэнтаў і 5 выкладчыкаў, трое з якіх ужо выбраны загадчыкамі кафедр.

СПРАВАЗДАЧЫ і выбары, сказаў у заключэнне даклада сакратар парткома, становяцца як бы калектыўным аглядам работы. Патрабаванні партыі сёння накіраваны на тое, каб весці яе па перабудове свядомасці, псіхалогіі, мыслення. І задача нашай партыйнай арганізацыі — зрабіць гэту перабудову як мага хутчэй. Выступаючы на сустрэчы ў ЦК КПСС з ветэранамі стаханаўскага руху, передавікамі і наватарамі вытворчасці Генеральны сакратар ЦК КПСС М. С. Гарбачоў сказаў: «...ідучы ленінскім курсам мы павінны былі зрабіць адказны гістарычны выбар,— і партыя яго зрабіла. Праз істотнае паскарэнне сацыяльна-эканамічнага прагрэсу —к дасягненню новага якаснага стану грамадства. І мы пойдзем гэтым шляхам, пойдзем няўхільна і паслядоўна. Цэнтр увагі цяпер павінен перамясціцца на практычную рэалізацыю вызначаных мер, на канкрэтныя справы, нялёгкую будзённую працу ўсіх без выключэння — няхай то рабочы, калгаснік, спецыяліст, вучоны, кіраўнік прадпрыемства ці галіны».

У такім ключы павінна весціся работа і ў Гомельскім дзяржаўным універсітэце. Гэта дазволіць мабілізаваць калектыў на дастойную сустрэчу XXX з'езда КПБ і XXVII з'езда КПСС, творча працаваць над рашэннем задач у XII пяцігодцы.

# ШЫРОКАЯ ПРАГРАМА ДЗЕЯННЯЎ

**(З ПАСТАНОВЫ СПРАВАЗДАЧНА-ВЫБАРНАГА ПАРТЫЙНАГА СХОДУ).**

**Справаздачна-выбарны партыйны сход, які прызнаў работу парткома здавальняючай, прыняў разгорнутую пастанову. Ёй прадугледжана:**

**— Парткому, рэктарату, партыйным бюро і дэканатам, прафкомам, камітэту ЛКСМБ, усім кафедрам універсітэта, кіруючыся рашэннямі красавіцкага і кастрычніцкага Пленумаў ЦК КПСС (1985 г.) усю работу калектыву ГДУ накіраваць на дастойную сустрэчу XXVII з'езда КПСС і XXX з'езда КПБ, глыбокае і творчае вывучэнне і абмеркаванне новай рэдакцыі Праграмы КПСС, змяненняў у Статуце КПСС, Асноўных напрамкаў эканамічнага і сацыяльнага развіцця СССР на 1986—1990 г.г. і на перыяд да 2000 года.**

**— У святле патрабаванняў красавіцкага і кастрычніцкага Пленумаў ЦК КПСС (1985 г.) парткому, рэктарату, партыйным арганізацыям падраздзяленняў забяспечыць умацаванне партыйнай, вытворчай і выканаўчай дысцыпліны.**

**У мэтах павышэння персанальнай адказнасці камуністаў за даручаны ўчастак работы практыкаваць вывучэнне стылю і метадаў дзейнасці кіраўнікоў падраздзяленняў, сакратароў партбюро, партгрупоргаў.**

**Галоўную ўвагу ў вучэбнай і навукова-даследчай рабоце сканцэнтраваць на якаснай падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў, здольных працаваць у новых умовах. У гэтых мэтах парткому і партыйным бюро, галаўной групе і пастам народнага кантролю, прафкомам камітэту ЛКСМБ узяць пад пастаянны кантроль якаснае і творчае выкананне вучэбных планаў і паэтапнае правядзенне навуковых даследаванняў.**

**— Партыйнаму камітэту, рэктарату, прафкому павысіць патрабаванні да ўзроўню арганізацыі і якасці вучэбна-выхаваўчай, навуковай і грамадскай работы факультэтаў, кафедр, лабараторый і асобных навукова-педагагічных і інжынерна-тэхнічных работнікаў. З гэтай мэтай на працягу 1986 г. на аснове зацверджаных патрабаванняў распрацаваць і ўкараніць у практыку сістэму ацэнкі і аналізу ўсіх аспектаў дзейнасці падраздзяленняў і асобных работнікаў. Атрыманыя паказчыкі выкарыстоўваць пры падвядзенні вынікаў сацыялістычнага спаборніцтва, для выбару форм маральнага і матэрыяльнага стымулявання, распрацоўкі практычных мер па пераадоленню недахопаў, пры атэстацыі супрацоўнікаў і вызначэнні іх акладаў.**

**— Улічваючы істотныя недахопы ў арганізацыі самастойнай вучэбнай работы студэнтаў, абавязаць вучэбны аддзел, партыйныя арганізацыі факультэтаў, кафедру педагогікі і псіхалогіі прааналізаваць і абагуліць дзейнасць кафедр па рашэнню данай праблемы і правесці ў лютым 1986 г. навукова-метадычную канферэнцыю выкладчыкаў на тэму: «Псіхолага-педагагічныя асновы актывізацыі вучэбнай работы студэнтаў».**

**— У мэтах павышэння адказнасці куратараў акадэмічных груп за якасць і дзейснасць праводзімай імі выхаваўчай работы абавязаць дэканаты і партыйныя бюро ўвесці ў практыку абмеркаванне ў кожным семестры справаздач старшых куратараў на партыйных сходах і пасяджэннях саветаў факультэтаў.**

**— Парткому, партыйным бюро факультэтаў прадоўжыць работу па ўдасканальванню сістэмы марксісцка-ленінскай адукацыі выкладчыкаў і супрацоўнікаў факультэтаў. Звярнуць асаблівую ўвагу на забеспячэнне змястоўна-творчага падыходу да выбару асноўных напрамкаў дзейнасці метадалагічных семінараў, к пабудове іх тэматыкі, на ўзмацненне ўзаемасувязі навукі і практыкі.**

**— У мэтах пастаяннай антыалкагольнай прапаганды, зацвярджэння цвярозага ладу жыцця, арганізацыі безалкагольнага адпачынку, павышэння эфектыўнасці грамадскага кантролю за захаваннем заканадаўства па пераадоленню п'янства і алкагалізму, парткому, рэктарату, прафкомам і камітэту ЛКСМБ, дэканатам, партбюро і прафбюро ў 1986 годзе стварыць ва універсітэце пярвічную арганізацыю Усесаюзнага добраахвотнага таварыства барацьбы за цвярозасць.**

**— Рэктарату і парткому ў пачатку XII пяцігодкі распрацаваць і зацвердзіць у вышэйстаячых дзяржаўных інстанцыях рэальны план па будаўніцтву і развіццю матэрыяльна-тэхнічнай базы універсітэта.**

**— Камітэту ЛКСМБ у снежні 1985 г. падвесці вынікі студэнцкага будаўнічага руху ў XI пяцігодцы і да сакавіка 1986 г. распрацаваць перспектыўны план на XII пяцігодку з улікам патрэб развіцця народнай гаспадаркі Гомельскай вобласці.**

**— Парткому, камітэту ЛКСМБ аказаць неабходную дапамогу савету факультэта грамадскіх прафесій з мэтай ажыўлення яго работы.**

**— Дэканату і партбюро факультэта фізічнага выхавання, кафедры фізічнага выхавання, спартклубу, кіруючыся пастановамі ЦК КПСС «Аб далейшым развіцці масавай фізічнай культуры і спорту ў краіне» і «Аб мерах па паляпшэнню выкарыстання клубных установ і спартыўных збудаванняў», максімальна выкарыстоўваць наяўныя спартыўныя збудаванні ў мэтах павышэння ўзроўню фізічнага выхавання.**

**— Партыйнаму камітэту больш увагі і клопатаў удзяляць свайму друкаванаму органу — шматтыражнай газеце «Гомельскі універсітэт».**

**Рэдакцыйнай калегіі газеты «Гомельскі універсітэт» і яе пазаштатным аддзелам на старонках газеты глыбей і шырэй асвятляць работу рэктарата, дэканатаў па падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў, умацаванню дысцыпліны і выкананню функцыянальных абавязкаў работнікамі ГДУ, па павышэнню эфектыўнасці ідэйна-выхаваўчай і маcава-палітычнай дзейнасці універсітэцкіх грамадскіх арганізацый і фарміраванняў, ускрываць усе недахопы, якія перашкаджаюць якаснай падрыхтоўцы спецыялістаў, і дамагацца своечасовага рэагавання і прыняцця мер на крытычныя публікацыі.**

# У АГУЛЬНУЮ СПРАВУ — УКЛАД КОЖНАГА

каў з'яўляецца ўкараненне колькаснай сістэмы ацэнкі і аналізу ўсіх аспектаў дзейнасці падраздзяленняў і супрацоўнікаў.

Пра вынікі работы камсамольскай арганізацыі на партыйным сходзе паведаміў сакратар камітэта ЛКСМБ **В. А. Асіпенка.** Значны працоўны ўклад у XI пяцігодку ўнеслі студэнцкія будаўнічыя атрады. За гэты перыяд у патрыятычным руху ўдзельнічала 6 тысяч 147 юнакоў і дзяўчат. У розных галінах гаспадаркі імі асвоена капіталаўкладанняў амаль на 7 мільёнаў рублёў.

Камсамольскімі арганізацыямі універсітэта многае робіцца па ваенна-патрыятычнаму і інтэрнацыянальнаму выхаванню студэнцтва. Але разам з поспехамі ёсць і няўдачы. Правільнай прызнана прагучаўшая ў справаздачным дакладзе крытыка адносна недастатковай барацьбы з негатыўнымі з'явамі жыцця ў студэнцкім асяроддзі. На наш погляд, сказаў В. А. Асіпенка, ініцыятарамі сур'ёзнай размовы на гэту тэму ў калектывах груп абавязаны стаць камуністы, куратары. На такіх гутарках, дыспутах павінна ісці размова пра каштоўнасці сапраўдныя, а не надуманыя, аб абавязку, аб крытыцы спажывецкіх запатрабаванняў маладых людзей.

Пра дзейнасць галаўной групы і пастоў народнага кантролю расказаў член парткома, старшыня галаўной групы НК **У. Д. Арэшчанка.** Ён зазначыў, што праводзімыя праверкі павінны насіць больш глыбокі характар, народныя дазорныя абавязаны смялей унікаць ва ўсе сферы дзейнасці універсітэцкіх падраздзяленняў і не толькі выяўляць і ўхіляць недахопы, але і папярэджваць іх.

Аб павышэнні ролі партгрупы, як важнейшага звяна кожнай партыйнай арганізацыі, гаварыла на сходзе партгрупорг кафедры рускай літаратуры **В. А. Громава.**

На сучасным этапе камуністычнага будаўніцтва ўсё большае значэнне ў выхаванні і фізічнай загартоўцы маладога пакалення адыгрываюць фізічная культура і спорт. Як вядома, па гэтаму пытанню ў апошні час прыняты важныя пастановы партыі і ўрада. Аб іх ажыццяўленні ў калектыве універсітэта гаварыў загадчык кафедры фізвыхавання, намеснік старшыні прафкома **В. А. Каляда.** Ён звярнуў увагу на тое, што яшчэ не поўнасцю рэалізуюцца магчымасці па прыцягненню ўсёй студэнцкай моладзі, выкладчыкаў да актыўных заняткаў у спартыўных секцыях, групах здароўя. Да гэтага часу ва універсітэце застаецца слабай спартыўная база. Але, на жаль, нават тое, што ёсць, выкарыстоўваецца не ў поўнай меры.

Аб галоўным абавязку студэнта — паспяхова авалодваць абранай спецыяльнасцю, быць прыкладам у кожнай справе гаварыў з трыбуны партыйнага сходу пяцікурснік матэматычнага факультэта, член бюро ГК ЛКСМБ **В. А. Шведаў.** Нічым не апраўдана тое, адзначыў ён, што пэўную колькасць студэнтаў, якія дрэнна вучацца, а некаторыя і непрыстойна паводзяць сябе, пачынаючы з першага курса, «цягнуць» да дыплома. Ад такіх гора-спецыялістаў карысці будзе мала. Пазбаўляцца ад іх, калі ўжо не дапамагаюць ніякія меры ўздзеяння, трэба без прамаруджвання.

Як бы праграмным на новы перыяд работы прагучала на партыйным сходзе выступленне рэктара **Б. В. Бокуця.** Ён спыніўся на двух галоўных напрамках дзейнасці — падрыхтоўцы навукова-педагагічных кадраў і павышэнні ўзроўню падрыхтоўкі спецыялістаў у вышэйшай школе. Па яго словах, выклікае крайнюю трывогу падрыхтоўка доктарскіх дысертацый на матэматычным, эканамічным, гісторыка-філалагічным факультэтах і агульнауніверсітэцкіх кафедрах. Рэктар выказаў свае меркаванні па выпраўленню становішча. Разам з тым ён адзначыў, што існуючая цяпер сістэма падрыхтоўкі кадраў з вышэйшай адукацыяй не можа ў поўнай меры задаволіць патрэбы народнай гаспадаркі спецыялістамі, здольнымі перавесці яе на інтэнсіўны шлях развіцця. Таму неабходна шукаць новыя формы і метады, якія гарантавалі б неабходны поспех. У гэтым плане заслугоўвае ўвагі распрацаваная ў мінулым навучальным годзе Мінвузам РСФСР і ўжо рэалізуемая комплексная праграма мэтавай інтэнсіўнай падрыхтоўкі спецыялістаў. Гэты метад возьме ў свой арсенал і Гомельскі універсітэт.

